Весці БДПУ. Серыя 2. 2022. № 2. С. 39–44

*УДК 94(476) 1921/1939*

# ПРАСАПАГРАФІЯ ДЗЕЯЧАЎ БЕЛАРУСКАГА НАЦЫЯНАЛЬНАГА РУХУ Ў МІЖВАЕННАЙ ЗАХОДНЯЙ БЕЛАРУСІ: ПРАФЕСІЙНЫ І ГЕНДАРНЫ АСПЕКТЫ

**А. С. Горны,**
*кандыдат гістарычных навук, дацэнт, дацэнт кафедры гісторыі Беларусі, археалогіі і спецыяльных гістарычных дысцыплін ГрДУ імя Янкі Купалы*

*UDC 94(476) 1921/1939*

# PROSOPOGRAPHY OF BELARUSIAN NATIONAL MOVEMENT ACTIVISTS IN INTERWAR WESTERN BELARUS: ROFESSIONAL AND GENDER ASPECT

**A. Gorny,**
*PhD in History, Associate Professor, Associate Professor of the Department of History of Belarus, Archeology and Special Historical Disciplines, Grodno State University named after Yanka Kupala*

Паступіў у рэдакцыю 23.03.22.

Received on 23.03.22

У артыкуле ўпершыню ў айчыннай гістарыяграфіі разглядаюцца прафесійны і гендарны аспекты калектыўнай біяграфіі актывістаў беларускага нацыянальнага руху ў міжваеннай Польшчы. З дапамогай метаду прасапаграфіі, які дазваляе вызначыць сацыяльныя сувязі і заканамернасці развіцця той ці іншай супольнасці людзей, раскрываецца шырокі спектр удзелу ў беларускім руху розных прафесійных груп, узровень іх зацікаўленасці беларускім рухам, а таксама ўзаемаадносіны жанчын і мужчын у межах палітычнай актыўнасці. Дзякуючы вывучэнню прафесійных характарыстык актывістаў беларускага руху, можна прыйсці да высновы, што беларуская дзейнасць у Заходняй Беларусі выйшла на масавы ўзровень і ахапіла шматлікія прафесійныя групы – ад сялянства да навучэнцаў. У гендарным плане ў міжваенны перыяд жанчыны пачынаюць актыўна далучацца да беларускіх структур, з’яўляючыся актывісткамі пераважна левարадыкальных арганізацый.

*Ключавыя словы:* прасапаграфія, беларускі нацыянальны рух, Заходняя Беларусь, міжваенны перыяд, Польшча, нацыянальнае пытанне.

For the first time in domestic historiography the article considers professional and gender aspects of collective biography of the activists of Belarusian national movements in interwar Poland. With the help of the method of prosopography that helps to identify the social connections and regularities of development of certain community of people we reveal a wide range of participation in Belarusian movement of different professional groups, level of their interest with Belarusian movement as well as interrelations of women and men within the limits of political activity. Due to studying professional characteristics of the activists of Belarusian movement we can conclude that Belarusian activity in Western Belarus went out to mass level and covered numerous professional groups – from peasantry to students. In the plane of gender in interwar period women start to actively join Belarusian structures, mostly as activists of left-radical organizations.

*Keywords:* prosopography, Belarusian national movement, Western Belarus, interwar period, Poland, national question.

*Уводзіны.* Прасапаграфія з’яўляецца на сённяшні час адным з перспектыўных і запатрабаваных метадаў гістарычных даследаванняў. Дадзены метад накіраваны на стварэнне калектыўных біяграфій або выяўленне вызначанага кола асоб, якія мелі агульныя палітычныя, сацыяльныя ці этнічныя рысы, дзеля вызначэння сацыяльных сувязей і заканамернасцей развіцця сацыяльнай ці нацыянальнай групы. Іншымі словамі, даследчыка, які карыстаецца метадам прасапаграфіі, менш цікавіць унутраны свет людзей, а больш знешнія характарыстыкі выбранай групы: паходжанне, адукацыя, кар’ера, гендарныя, прафесійныя, рэлігійныя паказчыкі [1, с. 96]. Прасапаграфія як метад даследавання ўжо дастаткова добра распрацаваны ў замежнай гістарыяграфіі, аднак у беларускай гістарычнай навуцы толькі апошнім часам пачалі з’яўляцца грунтоўныя навуковыя даследаванні ў гэтым кірунку.

У рэчышчы даследавання гісторыі беларускага нацыянальнага руху ў Заходняй Беларусі ў гістарыяграфіі дастаткова шырока прадстаўлена персанальная гісторыя многіх вядомых нацыянальных дзеячаў, лідараў шэрагу беларускіх арганізацый і ўстаноў міжваеннага перыяду. У гэтым кірунку ажыццяўляліся даследаванні гісторыкаў А. Бергман (біяграфія Б. Тарашкевіча), Ю. Туронка (В. Іваноўскі), А. Сідарэвіча (А. Луцкевіч), А. Вашкевіча (кс. В. Гадлеўскі), А. Чарнякевіча (П. Аляксюк), А. Смалянчука (Р. Скірмунт) і інш. [2, с. 175, 195, 205, 207, 209]. Тым не менш мікраўзровень беларускага нацыянальнага руху, лёсы т. зв. «маленькіх людзей», якія з’яўляліся малавядомымі беларускімі актывістамі ў роз-

ных рэгіёнах, засталіся маладаследаванымі. У айчынным гістарычным дыскурсе па-ранейшаму не створана калектыўная біяграфія шэраговых удзельнікаў беларускага нацыянальнага руху ў Заходняй Беларусі, што ставарае пэўныя перашкоды для вывучэння мікрагісторыі і гісторыі паўсядзённасці гэтага рэгіёну ў міжваенны перыяд. Выкарыстанне метаду прасапаграфіі дазволіць увесці ў даследчыцкае поле сотні тысяч беларускіх актывістаў, якія ва ўмовах палітыкі паланізацыі спрабавалі захаваць і пашырыць нацыянальную ідэнтычнасць беларусаў.

Пры вывучэнні прасапаграфіі дзеячаў беларускага руху ў Заходняй Беларусі неабходна вылучыць пэўныя крытэрыі аналізу, з якіх будзе складацца «калектыўны партрэт» беларускіх актывістаў. Такімі даследчыцкімі маркерамі могуць выступаць фактары далучэння да беларускага нацыянальнага руху, узроставыя характарыстыкі, адукацыйны узровень, рэлігійныя перакананні, умовы «выхаду» чалавека з нацыянальнай актыўнасці і адаптацыі да польскага грамадства і інш. Кожны з гэтых крытэрыяў патрабуе грунтоўнага вывучэння шырокага кола дакументальных крыніц і эгадакументаў. У дадзеным артыкуле ўвага была звернута на асаблівасцях двух аспектаў «калектыўнай біяграфіі» беларускіх дзеячаў Заходняй Беларусі – прафесійным і гендарным. Менавіта гэтыя аспекты ў большай ступені раскрываюць сацыяльны крытэрый у прасапаграфічным аналізе і даюць магчымасць вызначыць прычыны ўдзелу ў беларускім руху тых ці іншых прафесійных груп, узровень іх зацікаўленасці беларускім рухам, а таксама ўзаемаадносіны жанчын і мужчын у межах палітычнай актыўнасці. Для аналізу гэтых аспектаў аўтарам выкарыстоўваліся дакументы ўнутрыпартыйнага справаводства, справаздачы і статыстычныя дакументы польскіх органаў улады, эгадакументы беларускіх актывістаў міжваеннага перыяду з розных рэгіёнаў Заходняй Беларусі.

*Асноўная частка.* Беларускі нацыянальны рух, які ў пачатку ХХ ст. пачаў фарміравацца ў арганізаваную палітычную з'яву, першапачаткова быў дастаткова аднародным у прафесійным плане. Да Першай сусветнай вайны актывісты гэтага руху былі пераважна студэнтамі, настаўнікамі ці журналістамі, невялікая доля дзеячаў працавала дробнымі служачымі ў розных установах Расійскай імперыі. Падзеі Лютаўскай рэвалюцыі 1917 г. і перыяд станаўлення беларускай дзяржаўнасці ў 1918–1920 гг. значна пашырылі прафесійныя характарыстыкі актывістаў.

У міжваеннай Заходняй Беларусі, дзе беларускі рух ва ўмовах іншай дзяржаўнасці выступаў спадкаемцам дарэвалюцыйных традыцый барацьбы за нацыянальную ідэнтычнасць, працэс уцягнення новых дзеячаў набыў значныя маштабы і перайшоў у статус масавага руху. Выбарчая кампанія 1922 г. у польскі парламент, школьная кампанія 1925 г. у Заходняй Беларусі прыводзяць у беларускі рух людзей розных прафесійных заняткаў, у першую чаргу – юрыстаў, медыкаў, святароў, навучэнцаў, былых афіцэраў царскай арміі. Гэтыя палітычныя кампаніі сталі значным штуршком для актывізацыі таксама і сялянства, якое мела перавагу сярод прафесійных груп беларускага насельніцтва Заходняй Беларусі. Асабліва масава рэкрутаванне сялян у беларускі рух пачалося ў сярэдзіне 1920-х гг., што звязана, з аднаго боку, з усплёскам дзейнасці Беларускай сялянска-работніцкай грамады (БСРГ) і Камуністычнай партыі Заходняй Беларусі (КПЗБ), а з другога – з непапулярнай эканамічнай і нацыянальнай палітыкай польскіх уладаў. У гуртках БСРГ прысутнасць сялян была наўпрост дамінуючай. Напрыклад, сярэднестатыстычны гурток арганізацыі ў в. Варацішча Нясвіжскага павета складаўся з 12 сябраў, якія род сваіх заняткаў у партыйных білетах вызначалі як «земляробы» з хатняй адукацыяй [3, арк. 64–74]. Паводле сведчанняў сакратара Цэнтральнага сакратарыяту БСРГ М. Бурсевіча, з усёй колькасці сябраў арганізацыі 85,5 % былі сяляне, аднак у кіраўнічых структурах Грамады на лідарскім узроўні палова актывістаў па прафесійных характарыстыках адносілася да інтэлігенцыі [4, с. 554]. Сяляне з'яўляліся асноўнай масай членаў і яшчэ адной левaрадыкальнай беларускай арганізацыі – КПЗБ. Нягледзячы на тое што па ўсіх праграмных і ідэалагічных параметрах, гэта партыя павінна была дзейнічаць у асноўным у рабочым прафесійным асяроддзі, падаўляючая большасць яе актыву былі земляробы, што рабіла з яе не зусім класічную камуністычную партыю ленінскага тыпу. Так, у 1933 г. сярод больш за 2600 актывістаў КПЗБ толькі 88 з'яўляліся рабочымі ці прадстаўнікамі інтэлігенцыі [5, арк. 13адв.].

Падобная сітуацыя была не толькі ў левaрадыкальных структурах, але і ў нацыянальна-дэмакратычных арганізацыях беларускага насельніцтва. У прыватнасці, у гуртках Беларускага інстытута гаспадаркі і культуры (БІГіК) пераважная доля шэраговых сябраў была прадстаўнікамі сялянства. Як сведчыць фармуляр штогадовай справаздачы гуртка БІГіК, у в. Шутовічы Ашмянскага павета земляробствам займаліся ўсе 30 сябраў гэтай структурнай адзінкі [6, арк. 6–6 адв.]. Сярод усёй колькасці рэгіянальных гурткоў БІГіК гарадскія складалі ўсяго 9 %, таму відавочна, што калектыўная

біяграфія падаўляючай большасці сябраў гэтай арганізацыі нацыянальна-дэмакратычнага кірунку мела сялянскія абрысы [7, с. 231–236]. У той жа час беларускія паланафільскія арганізацыі не змаглі ахапіць сваім уплывам сялянскае асяроддзе, хоць, безумоўна, падобныя спробы рабіліся рознымі структурамі гэтай палітычнай плыні. Такія арганізацыі, як Краёвая сувязь, Часовая беларуская рада, Беларуская радыкальная народная партыя, таварыства «Прасвета» і інш., стваралі свае гурткі ў вёсках, аднак тыя існавалі недоўгачасова, бо прапольскія ідэі не мелі шырокай папулярнасці ў большасці беларускага сялянскага насельніцтва і ўспрымаліся негатыўна. Таму беларускія паланафілы абмяжоўвалі сваю дзейнасць пераважна гарадскім асяроддзем, дзе да іх далучаліся прадстаўнікі інтэлігенцыі і вучнёўскай моладзі. Паказальна, што ў шэрагах беларускага паланафільства нярэдка можна было сустрэць прадстаўнікоў двух прафесійных груп. Да першай належалі афіцэры былых беларускіх вайсковых адзінак часоў польска-савецкай вайны, якім імпанаваў антыбальшавіцкі характар беларускіх паланафільскіх арганізацый і іх цеснае супрацоўніцтва з уладамі. Другую групу складалі праваслаўныя святары, якія падкрэслівалі сваю лаяльнасць да дзяржаўных інстытутаў, але ў той жа час жадалі прымаць пэўны ўдзел у нацыянальным руху [8, с. 28–29].

Пашырэнне беларускага руху на сялянскае асяроддзе ў Заходняй Беларусі і яго выхад з уласнай «зоны камфорту» стаў магчымым, у тым ліку дзякуючы дзейнасці вясковай і гарадской беларускай інтэлігенцыі. Як падкрэсліў польскі сацыёлаг С. Віславух, які ў міжваенны перыяд праводзіў анкетаванне насельніцтва паўночна-ўсходніх ваяводстваў Польшчы, кожная беларуская вёска, што мела ўласную інтэлігенцыю, дастаткова свядома і варожа ставілася да польскай дзяржаўнасці [9, с. 97]. Пры гэтым у міжваенны перыяд пашыраецца прафесійная характарыстыка беларускіх інтэлігентаў: цяпер гэта ўжо не толькі настаўнікі ці журналісты. Напрыклад, у 1920-я гг. у Лідскім павеце сярод беларускага актыву сустракаюцца фельчары, канцылярскія служачыя, чыгуначнікі і інш. [10, арк. 184, 207, 340адв.–341]. Недаацэненай у айчыннай гістарыяграфіі з'яўляецца роля праваслаўных святароў у пашырэнні і ўмацаванні нацыянальнай ідэнтычнасці беларусаў у міжваеннай Польшчы. Вядома, што многія з іх праводзілі актыўную агітацыю на карысць беларускіх сіл падчас выбарчай кампаніі ў польскі парламент 1922 г. У тым жа Лідскім павеце ў сярэдзіне 1920-х гг. польская паліцыя лічыла «беларускімі агітатарамі» праваслаўных святароў у вёсках Мыта, Мураванка, Бабры, Збляны, Дакудава, мястэчку Астрына [10, арк. 147, 161, 184, 196, 416, 1511]. Паралельна з гэтым у міжваенны перыяд у беларускім руху ў розных формах прымалі ўдзел каля 50 каталіцкіх ксяндзоў [11, s. XXXII].

У 1930-я гг. беларускі рух ў Заходняй Беларусі значна пашырыў свае прафесійныя характарыстыкі, бо першыя працоўныя месцы пачыналі атрымліваць выпускнікі польскіх і еўрапейскіх універсітэтаў, у першую чаргу, чэхаславацкіх, якія вырашылі будуваць сваю кар'еру на радзіме. Ва ўніверсітэцкія гады яны ўдзельнічалі ў розных беларускіх моладзевых структурах, аднак цяпер самі сталі праваднікамі беларускасці ў сваіх мясцовасцях. Таму ў вёсках і гарадах Заходняй Беларусі з'яўляюцца лекары, юрысты, інжынеры, аграномы, уцягнутыя ў беларускую актыўнасць і ў той жа час рэалізуючыя свае прафесійныя здольнасці ў рамках польскіх грамадскіх і эканамічных інстытутаў. Прыкладам тут можа выступаць біяграфія інжынера Міколы Гарошкі, выпускніка Пражскай палітэхнікі, які вярнуўся ў сваю вёску Трашчыцы Стаўбцоўскага павета і арганізаваў там беларускі кааператыў, а пасля займаўся будаўніцтвам мастоў [12, с. 156].

Важным крытэрыем для прасапаграфічнага даследавання беларускага нацыянальнага руху ў Заходняй Беларусі могуць быць гендарныя суадносіны і характарыстыкі. Беларуская нацыянальная актыўнасць яшчэ з пачатку XX ст. мела значныя праявы мускуліннасці, што ў першую чаргу было звязана з гендарнымі асаблівасцямі традыцыйнага беларускага грамадства. Беларускія жанчыны на той час выконвалі выключна ролю хатніх гаспадынь, а спробы рэалізацыі сябе ў іншых, больш вышэйшых сферах былі нязначнымі. На 1897 г. толькі 3 % праваслаўных беларусак у беларускіх губернях былі пісьменнымі [13, с. 37]. Таму жаночая эмансіпацыя ў Расійскай імперыі ў пачатку XX ст. прывяла ў беларускі рух нязначную колькасць жанчын. Фактычна «фемініннасць» беларускага нацыянальнага руху зводзілася да рамак школьных настаўніц, якімі і з'яўляліся большасць актывістак. Выключэннем тут можа быць біяграфія П. Бадуновай, якая дзякуючы сацыяльным ліфтам рэвалюцыі 1917 г. дасягнула пасады народнага сакратара апекі ў першым урадзе БНР.

У Заходняй Беларусі ў міжваенны перыяд у беларускай актыўнасці перавага мужчын была відавочнай, а роля жанчын як настаўніц значна пашырылася з узнікненнем беларускіх гімназій і пачатковых школ. Тым не менш у тагачасным беларускім грамадстве, як і ў польскім у цэлым, яшчэ працягвала дамінаваць стаўленне да палітыкі як да нежаноцкай справы і сферы, якая знаходзіцца далёка ад хатніх

УМК БГПУ

інтарэсаў звычайнай кабеты, асабліва з сялянскага асяроддзя [14, s. 32]. Працэсы далучэння жанчын да палітычнага жыцця, звязаныя ў першую чаргу з левардыкальным дыскурсам і прыкладамі жаночай эмансіпацыі ў БССР пастулова пранікалі ў заходнебеларускую вёску, але ў пачатку і сярэдзіне 1920-х гг. яны яшчэ былі малазаўважаныя. Напрыклад, у спісе гурткоў БСРГ Слонімскага павета за 1926 г., які ахопліваў прыблізна 109 гурткоў з колькасцю ўлічаных актывістаў у 340 чалавек, можна знайсці ўсяго адну жанчыну [15, арк. 319–323]. Разам з гэтым, палітычны ўздым, звязаны са з'яўленнем і дзейнасцю БСРГ, уплываў у тым ліку і на ўцягванне беларусак у палітычную і нацыянальную барацьбу. У лютым 1927 г. у тым жа Слоніме падчас дэманстрацыі ў абарону ліквідаванай БСРГ значную ролю адыгрывалі дзяўчыны з бліжэйшых вёсак, якія адкрыта заяўлялі аб сваёй палітычнай пазіцыі [16, арк. 92]. Праз некалькі гадоў сітуацыя кардынальным чынам змяняецца і ў лакальных структурах левардыкальных арганізацый – Таварыства беларускай школы (ТБШ) і КПЗБ – прысутнасць маладых актывістак была ўжо нормай. У прыватнасці, у 1929 г. сярод зафіксаваных польскай паліцыяй 39 сябраў левардыкальных арганізацый у Вялікаберастаўіцкай гміне 10 (25,6 %) з'ўляліся жанчынамі. Па нацыянальным складзе большасць з іх (6 жанчын) былі яўрэйкамі, што адлюстроўвае больш хуткія працэсы распаду традыцыйных нормаў паводзін у яўрэйскім грамадстве, чым у беларускім. Пры гэтым бераставіцкія актывісткі былі вельмі маладымі дзяўчынамі – іх узрост вагаўся ад 18 да 23 гадоў [17, арк. 188–191адв.]. У 1929–1930 гг., дзякуючы прасапаграфічнаму аналізу, можна ўстанавіць, што ў гуртки ТБШ у Скідзельскай, Вялікаберастаўіцкай, Азёрскай гмінах прыходзіць жаночы актыў, хоць і не ў вялікіх прапорцыях. Скідзельскі гурток ТБШ у верасні 1929 г. налічваў 12 актывістаў – 9 мужчын і 3 жанчыны маладога ўзросту [18, арк. 72]. Неабходна заўважыць, што ў прааналізаваных вышэй гуртках ТБШ большасць дзяўчын былі сваякамі мужчын-сябраў, пераважна іх сёстрамі.

У Беластоцкім ваяводстве ў міжваенны перыяд адной з самых вядомых актывістак беларускага леварадыкальнага руху была Вера Валейка. Яна нарадзілася ў 1907 г. у сялянскай сям'і у в. Бераставічаны Вялікаберастаўіцкай гміны. У 19 гадоў Валейка далучылася да мясцовых структур БСРГ, а пасля з'ўлялася сябрам гуртка ТБШ у сваёй роднай вёсцы. У гэты перыяд, паводле сведчанняў польскай паліцыі, яна нідзе не працавала і жыла за кошт бацькоў. Актыўнасць дзяўчыны была заўважана мясцовымі леварадыкаламі, што прадвызначыла яе шчыльныя кантакты са структурамі КПЗБ. Падчас падрыхтоўкі да міжнароднага сялянскага кангрэсу ў Берліне ў 1930 г. Валейка была арыштавана польскімі ўладамі і асуджана да 4 гадоў зняволення. Паказальна, што пасля вызвалення з турмы Валейка не «перагарэла» і працягнула ўдзельнічаць у беларускім руху: у 1936 г. бераставіцкая паліцыя ўзгадвала яе сярод мясцовых актывістаў. Пасля верасня 1939 г. савецкія «сацыяльныя ліфты» далі магчымасць маладой жанчыне стаць дэпутатам Вярхоўнага савета БССР [17, арк. 188; 19, арк. 331].

Як падкрэслівалася вышэй, прыход жанчын-актывістак у беларускі рух у першую чаргу быў звязаны з яго левардыкальнай плынню. У КПЗБ, БСРГ і ТБШ у 1920–1930-я гг. назіралася заўважаная прысутнасць жанчын, якія займалі не апошнія пазіцыі ў арганізацыйным жыцці, што нельга сказаць пра іншыя беларускія арганізацыі міжваеннай Польшчы. Напрыклад, у гродзенскай акруговай управе ТБШ на 1927 г. з 7 чалавек працавала 3 жанчыны, сярод якіх адна – Надзея Ламашэвіч – вылучалася сваёй актыўнасцю у мясцовым грамадскім жыцці і ўдзелам у розных гарадскіх акцыях і мерапрыемствах [20, с. 232]. У 17 павятовых камітэтах БСРГ – партыі, якая характарызавалася значным дамінаваннем мужчын, у 1926 г. на неапошніх пазіцыях працавалі дзве жанчыны (А. Бурневіч, К. Гоцка) [21, арк. 2-2 адв.]. Паказальна, што большая частка жанчын у левардыкальных беларускіх арганізацыях былі выхадцамі з праваслаўнага асяроддзя, якое ў 1920-я гг. аказалася вельмі ўспрымальным да секулярных і сацыялістычных ідэй. Нездарма у крыніцах сустракаюцца сведчанні, што нават дачкі праваслаўных святароў на Гродзеншчыне дапамагалі беларускім левардыкальным арганізацыям [22, арк. 143]. У той жа час удзел беларусак у арганізацыях хрысціянска-дэмакратычнай накіраванасці (БХД, БІГіК) быў нязначным. У кіраўнічых структурах БІГіК за ўсю гісторыю існавання арганізацыі не было ніводнай жанчыны [7, с. 220–223]. Такая розніца паміж беларускімі левардыкальнымі і хрысціянска-дэмакратычнымі арганізацыямі магла тлумачыцца дзейнасцю у рамках апошніх структур актывістаў пераважна з каталіцкіх рэгіёнаў Заходняй Беларусі, дзе на бытавым узроўні яшчэ захоўвалася дастаткова кансерватыўнае стаўленне да палітычнай эмансіпацыі жанчыны.

*Заключэнне.* Такім чынам, з дапамогай метаду прасапаграфіі можна правесці грунтоўнае даследаванне сацыяльных асаблівасцей функцыянавання беларускага нацыянальнага руху ў міжваеннай Заходняй Беларусі. У дадзеным артыкуле акцэнт рабіўся на вызначэнні пра-

УЧ БДПУ

фесійных і гендарных характарыстык актывістаў гэтага руху, якія раскрываюць сацыяльны крытэрый прасапаграфічнага аналізу. У прафесійным плане беларуская дзейнасць у Заходняй Беларусі выйшла на ўзровень масавасці, пра што сведчыць уцягненне ў яе шматлікіх прафесійных груп, і ў першую чаргу найбольш масавай групы беларускага насельніцтва – сялянства. Фактычна тыя ідэі аб шырокім распаўсюджванні беларускай нацыянальнай свядомасці, якія агучваліся пачынальнікамі нацыянальнага руху ў канцы XIX – пачатку XX ст., былі ў поўнай меры рэалізаваны ў 1920-я гг. у Заходняй Беларусі пасля шэрагу палітычных акцый – выбараў у польскі парламент 1922 г., узнікнення і дзейнасці БСРГ і інш. Тысячы актывістаў беларускага руху ў Польшчы былі не толькі настаўнікамі ці журналістамі, але і земляробамі, гарадскімі рабочымі, служачымі, святарамі розных канфесій, што не дае падстаў ацэньваць гэты рух як слабую маргінальную з’яву.

Абуджэнне беларускага руху ў 1920-я гг., дзейнасць БСРГ як масавай партыі прывялі да зменаў і ў гендарным кірунку. Жанчыны пачынаюць актыўна далучацца да дзейнасці беларускіх структур у адрозненне ад папярэдніх перыядаў, калі жаночая эмансіпацыя ў беларускім руху была на ўзроўні адзінак. Нягледзячы на ранейшую пераважнасць мужчын, асабліва на вышэйшых лідарскіх ярусах палітычнай дзейнасці, арэал актыўнасці беларускіх жанчын – гэта ў асноўным леварадыкальныя арганізацыі (КПЗБ, БСРГ, ТБШ), якія ў поўнай ступені дазвалялі маладым беларускім дзяўчынам рэалізаваць свае нацыянальныя і палітычныя амбіцыі.


*Літаратура і крыніцы*

1. *Ганчарэнка, С. А.* Прасапаграфія: гісторыя станаўлення і развіцця метаду / С. А. Ганчарэнка // Часопіс Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта. Гісторыя. – 2017. – № 3. – С. 94–100.
2. *Савіч, А. А.* Айчынная гістарыяграфія гісторыі Заходняй Беларусі 1921–1939 гг. : манаграфія / А. А. Савіч. – Брэст : БрДУ, 2019. – 300 с.
3. Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь (далей – НАРБ). – Ф. 882. Воп. 1. Спр. 36.
4. Борьба трудящихся Западной Белоруссии за социальное и национальное освобождение и воссоединение с БССР: документы и материалы / редколл. : В. И. Гурский [и др.]. – Минск : Госиздат БССР, 1962. – Т. 1 (1921–1929 гг.). – 620 с.
5. НАРБ. – Ф. 242п. Воп. 1. Спр. 266.
6. Lietuvos Centrinis Valstybės Archyvas (Цэнтральны дзяржаўны архіў Літвы, далей – LCVA) – F. 361. Ap. 2. B. 7.
7. *Разуванава, К. С.* Беларускі інстытут гаспадаркі і культуры ў Заходняй Беларусі (1926–1936 гг.) / К. С. Разуванава. – Мінск : Беларуская навука, 2013. – 247 с.
8. *Горны, А.* Беларускія паланафільскія арганізацыі на тэрыторыі Заходняй Беларусі ў міжваенны перыяд / А. Горны // Беларускі гістарычны часопіс. – 2015. – № 4. – С. 26–33.
9. *Віславух, С.* Нацыянальныя адносіны на тэрыторыі ўсходніх ваяводстваў / С. Віславух // Arche. – 2018. – № 1. – С. 69–358.
10. Дзяржаўны архіў Гродзенскай вобласці (далей – ДАГВ). – Ф. 200. Воп. 1. Спр. 17.
11. *Garbiński, J.* Białoruski ruch chrześcijański XX wieku: słownik biograficzno-bibliograficzny / J. Garbiński, J. Turonek. – Warszawa, 2003. – 519 s.
12. Дакументы і матэрыялы па гісторыі беларускай эміграцыі ў Чэхаславацкай Рэспубліцы (1918–1939) / уклад., прадм., камент. А. Бучы. – Мінск : Кнігазбор, 2020. – 560 с.
13. *Міхалюк, Д.* Беларуская Народная Рэспубліка 1918–1920 гг.: ля вытокаў беларускай дзяржаўнасці / Д. Міхалюк. – Смаленск : Інбелкульт, 2015. – 496 с.

*References*

1. *Hancharenka, S. A.* Prasapagrafiya: gistoryya stanaūlennya i razviccya metadu / S. A. Gancharenka // Chasopis Belaruskaga dzyarzhaūnaga ūniversiteta. Gistoryya. – 2017. – № 3. – S. 94 –100.
2. *Savich, A. A.* Ajchynnaya gistaryyagrafiya gistoryi Zahodnyaj Belarusi 1921–1939 gg. : managrafiya / A. A. Savich. – Brest : BrDU, 2019. – 300 s.
3. Nacyyanal’ny arhiū Respubliki Belarus (dalej – NARB). – F. 882. Vop. 1. Spr. 36.
4. Bor’ba trudyashchihsya Zapadnoj Belorussii za social’noe i nacional’noe osvobozhdenie i vossoedinenie s BSSR: dokumenty i materialy / redkoll. : V. I. Gurskij [i dr.]. – Minsk : Gosizdat BSSR, 1962. – T. 1 (1921–1929 gg.). – 620 s.
5. NARB. – F. 242p. Vop. 1. Spr. 266.
6. Lietuvos Centrinis Valstybės Archyvas (Central’ny dzyarzhaūny arhiū Litvy, dalej – LCVA) – F. 361. Ap. 2. B. 7.
7. *Razuvanava, K. S.* Belaruski instytut gaspadarki i kul’tury ū Zahodnyaj Belarusi (1926–1936 gg.) / K. S. Razuvanava. – Minsk : Belaruskaya navuka, 2013. – 247 s.
8. *Gorny, A.* Belaruskiya palanafil’skiya arganizacyi na terytoryi Zahodnyaj Belarusi ū mizhvaenny peryyad / A. Gorny // Belaruski gistarychny chasopis. – 2015. – № 4. – S. 26–33.
9. *Vislavuh, S.* Nacyyanal’nyya adnosiny na terytoryi ūskhodnih vayavodstvaū / S. Vislavuh // Arche. – 2018. – № 1. – S. 69–358.
10. Dzyarzhaūny arhiū Grodzenskaj voblasci (dalej – DAGV). – F. 200. Vop. 1. Spr. 17.
11. *Garbiński, J.* Białoruski ruch chrześcijański XX wieku: słownik biograficzno-bibliograficzny / J. Garbiński, J. Turonek. – Warszawa, 2003. – 519 s.
12. Dakumenty i materyyaly pa gistoryi belaruskaj emigracyi ў Chekhaslavackaj Respublicy (1918–1939) / uklad., pradm., kament. A. Buchy. – Minsk : Knigazbor, 2020. – 560 s.
13. *Mihalyuk, D.* Belaruskaya Narodnaya Respublika 1918–1920 gg.: lya vytokaū belaruskaj dzyarzhaūnasci / D. Mihalyuk. – Smalensk : Inbelkul’t, 2015. – 496 s.

14. Dufrant, Joanna. Prasa politycznych organizacji kobiecych w Polsce w latach 1917-1939 / Joanna Dufrant // Polityka i politycy w prasie XX i XXI wieku. Prasa organizacji politycznych / pod red. Małgorzaty Dajnowicz i Adama Miodowskiego. – Białystok, 2017. – S. 31–48.
15. ДАГВ. – Ф. 687. Воп. 2. Спр. 7.
16. НАРБ. – Ф. 242п. Воп. 1. Спр. 231.
17. ДАГВ. – Ф. 27. Воп. 1. Спр. 26.
18. ДАГВ. – Ф. 24. Воп. 1. Спр. 24.
19. ДАГВ. – Ф. 27. Воп. 1. Спр. 166.
20. *Чарнякевіч, А*. Айчына пад страхою. Гродна як лакальны асяродак беларускага нацыянальнага руху / А. Чарнякевіч // Arche. – 2014. – № 78. – С. 223–248.
21. НАРБ. – Ф. 242п. Воп. 1. Спр. 103.
22. ДАГВ. – Ф. 52. Воп. 1. Спр. 124.

14. Dufrant, Joanna. Prasa politycznych organizacji kobiecych w Polsce w latach 1917-1939 / Joanna Dufrant // Polityka i politycy w prasie XX i XXI wieku. Prasa organizacji politycznych / pod red. Małgorzaty Dajnowicz i Adama Miodowskiego. – Białystok, 2017. – S. 31–48.
15. DAGV. – F. 687. Vop. 2. Spr. 7.
16. NARB. – F. 242p. Vop. 1. Spr. 231.
17. DAGV. – F. 27. Vop. 1. Spr. 26.
18. DAGV. – F. 24. Vop. 1. Spr. 24.
19. DAGV. – F. 27. Vop. 1. Spr. 166.
20. *Charnyakevich, A.* Ajchyna pad strahoyu. Grodna yak lakal’ny asyarodak belaruskaga nacyyanal’naga ruhu / A. Charnyakevich // Arche. – 2014. – № 78. – S. 223–248.
21. NARB. – F. 242p. Vop. 1. Spr. 103.
22. DAGV. – F. 52. Vop. 1. Spr. 124.

УИЦ БГПУ